Кандыдат палітычных навук, прарэктар па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова», выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, паэт, празаік – усё гэта пра вучонага і творчую асобу **Уладзіміра Віктаравіча ЯСЕВА.**



Творчасць паэта У. Ясева шматгранная. Ён раскрывае тэмы духоўных патрэбаў чалавека: разуменне сябе і свайго жыцця, самавыяўленне, яднанне з іншымі людзьмі і навакольным светам, любоў да сваёй Радзімы, зямлі, роднай прыроды. Пісьменнік таксама паспяхова працуе і ў жанры прозы. Яго апавяданне «Выкуп ваўкалака» заняла першае месца ў Рэспубліканскім конкурсе фантастыкі, які праводзіцца Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Прызнанне атрымалі зробленыя Уладзімірам Ясевым пераклады твораў рускіх і ўкраінскіх аўтараў. Ён аўтар паэтычных зборнікаў «Времяворот», «Палова дыні».

«Чалавеку дадзена слова. У ім – усе бакі яго ўнутранага свету: адчуванні, перажыванні, разважанні, перакананні. Якія словы мы вымаўляем? Што мы адрасуем нашым чытачам? Нашы ўнутраныя дыялогі, нашы словы – гэта своеасаблівыя праграмы. Чалавек альбо стварае, альбо разбурае. Гэты працэс ідзе пастаянна. Кожны дзень, кожную гадзіну, кожнае імгненне мы, часта не задумваючыся, робім выбар: «Што сказаць? Як сказаць?» – лічыць Уладзімір Віктаравіч.

## Спеў

*Зыходзіць снег павольна ў чуласць дзён,*
*У зорнасць ночы, ватную нягучнасць,*
*Дзе рыфмаў мімавольнасць ва ўнісон*
*Пертварае словы і пачуцці,*

*Вяртае свет у чмут гарачых сноў.*
*Вясна бруіць. Галосіць кот на даху.*
*Я гукамі аглушаны ізноў,*
*Духмянасцю зямлі, аквітным пахам.*

*З усіх былых і ўсіх мажлівых страт,*
*Як крэўнаму, адзінаму нашчадку,*
*Апошні аглушальны снегапад*
*Вясне аддам у скарб, яе пачатку...*

*У буркатанні брудных ручаёў*
*Пачую спеў пра першую любоў.*

## Рыфма

*Спакойна хата спіць. Наўкол ні гуку.*
*Ад лямпы на паперы чысты круг.*
*Пяро рыпіць і націскае пругка,*
*Выводзіць вершаваных строф ланцуг,*

*Струменіць шчодра моўныя карункі,*
*Збіраючы аскепкі звыклых фраз.*
*Мінулых дзён рытмічныя малюнкі*
*Рыфмуюцца зацята, напаказ.*

*Ды толькі неразборлівы мой почырк*
*Ці данясе да вас сапраўдны гук?*
*У самым важным месцы – доўгі прочырк,*
*Шматкроп'і ў рыфмах – вынікі патуг.*

*Не хопіць рыфмы – выкраслю радкі,*
*Ды з лёсам не згуляць у паддаўкі.*